Запрашальнік

НА ВЫСОКАЙ НОЦЕ ТРАДЫЦЫІ

Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» чарговы раз збярэ майстроў і прыхільнікаў музычнага мастацтва ў Паставах 10—12 чэрвеня. Для пастаўчан і гасцей горада падрыхтавалі насычаную праграму, дзе будзе што ўбачыць, пачуць і пакаштаваць. Усяго задзейнічана каля 15 канцэртных і выставачных пляцовак, а колькасць удзельнікаў чакаецца каля 300 чалавек.

МУЗЫЧНЫЯ ВАНДРОЎКІ

— Сёлетні фестываль для нас асаблівы, таму што ён пройдзе ў Паставах у 30-ы раз. Як вядома, спачатку свята народнай музыкі праходзіла ў Віцебску і Магілёве, а пасля на доўгія гады музычна-культурны форум «прапісаўся» ў Паставах, — дзеліцца **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пастаўскага райвыканкама, дырэктар фестывалю Галіна ЧАПЛІНСКАЯ**. — Паколькі бягучы год у нашай краіне названы Годам гістарычнай памяці, то і аргкамітэт вялікую ўвагу ўдзяліў гісторыі нашага фестывалю, знакамітым музыкантам і грамадскім дзеячам, нашым землякам, усім тым, хто стаяў каля вытокаў мерапрыемства і замацоўваў аўтарытэт і прэстыж нашага міжнароднага форуму. Бо хто памятае сваю гісторыю, той упэўнена ідзе наперад. Году гістарычнай памяці мы прысвяцілі таксама шэраг мерапрыемстваў і праектаў, якія чакаюць усіх, хто завітае да нас у гэтыя дні.

Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама і Пастаўскі раённы выканаўчы камітэт.

Сёлета на свята ў Паставы завіталі самадзейныя артысты з усіх куточкаў Беларусі, а таксама лаўрэаты мінулых гадоў і прафесійныя калектывы. Усяго за гады існавання фестывалю на ім пабывалі тысячы ўдзельнікаў з 21 краіны свету. Зараз час і жыццё ўносяць свае карэктывы, але на свяце ўсё ж захоўваецца атмасфера еднасці, якой ніякія межы не перашкода. Так і гэтым разам тут будзе прадстаўлена нацыянальная культура і народная творчасць Расіі, Латвіі, Кітая і Туркменістана.

«ХТО КАГО?» І НЕ АБЫДЗЕЦЦА БЕЗ ДЭБЮТАЎ

— Апошнім часам, калі міжнародная абстаноўка вакол Беларусі несправядліва нагнятаецца, такія міжнародныя мерапрыемствы, як наш фестываль, яшчэ раз пацвярджаюць, што наша краіна міралюбівая, тут жывуць людзі ў сяброўстве і згодзе і ўмеюць працаваць і адпачываць, — дадае Галіна Чаплінская. — Вельмі прыемна, што свята народнай музыкі, нібы мост, аб'ядноўвае людзей з розных краін, раскрывае вялікі патэнцыял народнай культуры, дэманструе сапраўднае сузор'е талентаў. І для нас, пастаўчан, правядзенне такога мерапрыемства — значная падзея ў культурным жыцці раёна.

У суботу ўвазе наведвальнікаў прэзентуюць выставу «Цымбалы і гармонік — сувязь часоў і пакаленняў», дзе можна прасачыць адметныя старонкі гісторыі фестывальнага руху ў гэтай мясцовасці. Пройдзе і традыцыйны конкурс калектываў і асобных выканаўцаў на народных інструментах «Хто каго?». За званне найлепшага на гэты раз будуць змагацца 12 прэтэндэнтаў. Сёлета ў межах фестывалю ўпершыню пройдзе абласны агляд-конкурс эстраднай музыкі «Віятон-2022».

* * *

Больш за тры дзясяткі гадоў музычны форум з'яўляецца месцам сустрэчы прафесійных і самадзейных выканаўцаў як з Беларусі, так і з краін замежжа. Тут радуюць публіку сваім майстэрствам выканання народнай музыкі як на інструментах, так і голасам. Некаторыя музыканты, якія былі пастаяннымі гасцямі фестывалю ў розныя гады, цяпер, на жаль, ужо пайшлі з жыцця. Але вобразы гэтых людзей і памяць пра іх арганізатары вырашылі ўвекавечыць у скульптурнай кампазіцыі, праект якой распрацаваў беларускі скульптар Аляксандр Фінскі (ён даўно вядомы ў гэтым горадзе, і яго работы ўпрыгожваюць Паставы), а ўвасобіў ідэю яго калега, скульптар Андрэй Суднік. Урачыстае адкрыццё памятнага знака «Музычная сталіца Паазер'я» і Алеі знакамітых заснавальнікаў фестывалю пройдзе ў гарадскім парку ў нядзелю днём.

Алена ДРАПКО.

Больш падрабязна чытайце на сайце zviazda.by

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра 7 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.38	21.40	17.02
Віцебск —	4.20	21.38	17.18
Магілёў —	4.28	21.30	17.02
Гомель —	4.34	21.17	16.43
Гродна —	4.55	21.53	16.58
Брэст —	5.05	21.45	16.40

Імяніны

Пр. *Васіля, Ігната, Іраклія, Мікіты.*
К. *Дзіяны, Малгажаты, Ануфрыя, Багуміла, Генрыха, Эдгара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

10 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1562 год — у Нясвіжы выйшла кніга Сымона Буднага «Катэхізіс». Гэта была першая кніга на старабеларускай мове, якая пабачыла свет у Беларусі. У ёй аўтар тлумачыў не толькі рэлігійныя догматы, але і раскрываў сваё разуменне розных пытанняў сацыяльнага і грамадзянска-палітычнага жыцця. Захавалася 10 экзэмпляраў «Катэхізіса» — у Кракаве, Празе, Санкт-Пецярбургу і Маскве.

1812 год — адкрыта Полацкая езуіцкая акадэмія, першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1812—1820 гадах. Адкрыта на базе Полацкага езуіцкага калегіума, які дзейнічаў з 1580 г. як сярэдняя навучальная ўстанова. Валодала правамі ўніверсітэта, мела ў сваім складзе тры факультэты — тэалагічны, філасофскі, свабодных навук і старажытных і сучасных моў.

1902 год — нарадзіўся Барыс Львовіч Брадзянскі, расійскі сцэнарыст, кінакрытык, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Паводле яго сцэнарыяў створаны мастацкія фільмы «Першы ўзвод» і «Залатыя агні».

1977 год — нарадзіўся Аляксей Васільевіч Сінкевіч, беларускі спартсмен (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту Беларусі. Чэмпіён свету (2001), сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1997), бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1999, 2002). Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (2000).

У свеце

1832 год — нарадзіўся Нікалаус Аўгуст Ота, нямецкі канструктар і прадпрымальнік, адзін з распрацоўшчыкаў атмасфернага рухавіка. У 1884-м прапанаваў электрычнае запальванне, што дазволіла прымяніць для рухавіка вадкае паліва.

1907 год — стартаваў першы ў свеце аўтапрабег па маршруце Пекін — Парыж, арганізаваны рэдакцыяй французскай газеты «Матэн».

1922 год — нарадзіўся Барыс Сяргеевіч Бруноў, расійскі артыст эстрады, педагог, мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр Маскоўскага дзяржаўнага Тэатра эстрады, народны артыст РСФСР, прафесар. Выкладаў на факультэце эстрады Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва.

У гэты ж дзень нарадзілася Джудзі Гарленд, амерыканская кінаактрыса. Знялася ў мюзіклах «Для мяне і маёй дзяўчыны», «Пірат», а таксама ў кінафільмах «Нюрнбергскі працэс», «Дзіця чакае», «Я магла б працягваць спяваць».

Так гаварыў...

ІАГАН СТАБЕЙ:

«Не багацце сябар, а сябар — багацце».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1495. Нумар падпісаны ў 19.30
9 чэрвеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12